# УЗДЗЕЯННЕ ЭКСПАНАТАЎ МУЗЕЙНАЙ ЭКСПАЗІЦЫІ, МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ ТЭХНАЛОГІІ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ ЯК ЭФЕКТЫЎНЫЯ СРОДКІ МУЗЕЙНАГА ЎРОКА: ВУЧЭБНЫ ЗАНЯТАК ПА ВУЧЭБНЫМ ПРАДМЕЦЕ “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА” Ў VII КЛАСЕ ПА ТЭМЕ “НЕЗАГОЙНЫЯ РАНЫ ВАЙНЫ” (па творы Васіля Быкава “Незагойная рана”)

*Прохарава Ала Нікандраўна*

***Анатацыя.*** *Артыкул прысвечаны асвятленню пытання пра ўзаемадзеянне экспанатаў музейнай кампазіцыі, метадаў і прыёмаў тэхналогіі крытычнага мыслення пры правядзенні навучальных заняткаў у форме музейнага ўрока. Механізм уздзеяння культурных артэфактаў сумесна з прыёмамі тэхналогіі дэманструецца на прыкладзе вывучэння твора В. Быкава “Незагойная рана” на ўроку беларускай літаратуры ў VII класе па тэме “Незагойныя раны вайны”.*

Прапанаваны музейны ўрок беларускай літаратуры ў VII класе па творы Васіля Быкава “Незагойная рана” на тэму “Незагойныя раны вайны” — першы ў сістэме ўрокаў, адведзеных на вывучэнне твора. Навізна ўрока заключаецца ў форме падачы матэрыяла: праз уздзеянне экспанатаў музейнай экспазіцыі, накіраванай на патрыятычнае выхаванне вучняў. Чалавек, адданы роднай зямлі, – аснова выхавання грамадзяніна.

Вялікая колькасць заданняў апераджальнага характару сведчыць аб грунтоўнай папярэдняй падрыхтоўцы вучняў. На этапе стымулявання пазнавальнай актыўнасці кожны вучань удзельнічае ў працэсе пошуку адказаў на прапанаваныя пытанні і заданні.

Псіхалагічная падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу, фармулёўка праблемных пытанняў і заданняў, устаноўка на глыбокае вывучэнне і трывалае запамінанне спрыяюць якаснаму супрацоўніцтву “настаўнік-вучань”. Выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання на розных этапах урока, метадаў і прыёмаў тэхналогіі крытычнага мыслення, а таксама ўздзеянне экспанатаў музейнай экспазіцыі дапамагае эфектыўна арганізаваць працу з тэкстам, робіць змест урока даступным і наглядным.

Праверка дамашняга задання ажыццяўляецца праз гутарку і франтальнае апытанне, якое дапамагае зразумець узровень валодвання тэкстам. Музейная экспазіцыя стварае атмасферу рэалістычнасці, прымушае кожнага з вучняў асабіста настроіцца на працу. Пошук заканамернасцей, аналіз, сінтэз і абагульненне, прычынна-выніковыя сувязі – асноўныя прыёмы развіцця мыслення на розных этапах урока.

Чаргаванне відаў дзейнасці, тлумачэнне значэння незразумелых слоў з дапамогай прыкладаў, вобразнасць, эмацыянальнасць, змена інтанацый у працэсе падачы матэрыялу дазваляюць кіраваць увагай вучняў на ўроку. Улік індывідуальных і ўзроставых асаблівасцей вучняў, выкарыстанне ўласнага вопыту ў працэсе тлумачэння матэрыялу і працы з тэкстам, акцэнтаванне ўвагі на ключавых момантах твора і, як вынік, ключавых высновах, самастойна зробленых вучнямі, спрыяюць забеспячэнню якаснага ўспрымання матэрыялу.

Гістарычныя даведкі дазваляюць вучням асэнсавана дайсці да высновы і спрыяюць усведамленню таго, што вайна цесна звязана з рэальнасцю, што, у сваю чаргу, дазволіла вучням зразумець: вайна – трагедыя. Чытанне верша А.Бачылы “Ах, нашы маці…” прымушае вучняў псіхалагічна пранікнуцца тэмай і паспрыяе асабістай самааддачы ў працэсе супрацоўніцтва з настаўнікам.

На працягу ўсяго ўрока вучні стымулююцца да самаацэнкі і ўзаемаацэнкі.

Мэта ўрока — правесці аналіз апавядання Васіля Быкава “Незагойная рана” з выкарыстаннем экспанатаў школьнай музейнай экспазіцыі. Задачы ўрока: даць уяўленне пра асобу В.У. Быкава як пісьменніка-франтавіка; прааналізаваць драматычны змест апавядання, дэталёва раскрыўшы вобраз жанчыны-маці (побыт, аблічча, паводзіны, перажыванні); выхоўваць пачуццё патрыятызму, гонару за свой народ і яго вялікую гераічную гісторыю; фарміраваць чуласць, спагаду, эмпатыю; развіваць крытычнае мысленне; спрыяць развіццю вуснай і пісьмовай моў вучняў.

Абсталяванне — вучэбны дапаможнік[1]; партрэт В. Быкава; мультымедыйная прэзентацыя-суправаджэнне да ўрока; запіс песні ў выкананні Тамары Раеўскай “Калыханка маме” (словы Ніны Мацяш, музыка Яўгена Ксяневіча); індывідуальныя карткі-заданні для вучняў; выстава малюнкаў ваеннай тэматыкі; гексы па тэме ўрока. Прапануем план-канспект музейнага урока.

**I. Матывацыйны этап.**

Гаворка на сённяшнім уроку пойдзе пра тое, што кожнага з нас робіць Людзьмі: удзячная чалавечая памяць і адданая любоў да бацькоў.

*Вучань чытае верш А. Бачылы “Ах, нашы маці…”*

*Таго б ніколі не зазнаці*
*Нідзе нікому на зямлі…*
*Ах, нашы маці, нашы маці,*
*Што вы ў вайну перажылі!..*
*Як сіратліва з кожнай хаты*
*Дымілі ўранні каміны!..*
*А там жа… падалі салдаты,*

[1]Лазарук, М.А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 7-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А. Лазарук, Т. У. Логінава, Г. А. Сухава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017. – 240 с. : іл.

*Салдаты... Вашыя сыны.*
*А вы з тых даляў незнаёмых*
*Штодня чакалі іх... жывых.*
*Але... прыходзілі дадому*
*Вам пахаронкі замест іх.*
*Гаротным выцертым шынелем*
*Шарэў тады вам ранні час —*
*І вы дачасна ўсе сівелі,*
*Дачасна гора гнула вас.*
*І хоць вы долю праклінalі*
*І прачыналіся ад сноў,*
*Аднак... пакуль жылі — чакалі*
*Сваіх загінуўшых сыноў.*
*За ўменне ваша так чакаці —*
*Паклон вам нізкі да зямлі...*
*Ах, нашы маці, нашы маці,*
*Што вы за нас перажылі...*

Як вы думаеце, чаму менавіта з гэтага верша мне захацелася пачаць сёння нашу гутарку? *(Магчыма, па прычыне таго, што звечны закон быцця — жыццё і смерць побач — увасабляюць гэтыя радкі: маці нараджаюць дзяцей для шчасця, а вайна дае ім узамен гора).*

Прачытайце эпіграф да ўрока. Давайце паразважаем над яго зместам: *"Да болю можа кожны прыцярпецца / І да няшчасця, толькі не яны, / Што страцілі дзяцей... / Гарыць для іх цяпельца / На тым далёкім беразе вайны". (Пімен Панчанка).*

*Вучні запісваюць у літаратурныя сшыткі дату, тэму і эпіграф да ўрока.*

**II. Праверка дамашняга задання.**

Звярніце ўвагу на нашу музейную экспазіцыю і "сцяну болю" (дадатак 5). Як вы думаеце, што яна сімвалізуе? *(Боль і гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці).*

Чым абумоўлены мацярынскі боль у творы Васіля Быкава? *(Незагойнасцю раны сэрца і спадзяваннем на тое, што сын вернецца жывым. Боль аднаго асобна ўзятага чалавека зліваецца з болем мільёнаў ахвяр).*

Праверым веданне зместу твора. У вас на сталах ляжаць карткі-заданні — пераблытаныя цытаты (дадатак 1). Вам трэба пранумараваць іх згодна зместу. На працу вам адводзіцца тры хвіліны. Поспехаў!

*Узаемаправерка па картцы з адказамі* (дадатак 1).

**III. Эмацыянальны выклік (літаратурны доследа).**

Звярніце ўвагу на экспанат з музейнай экспазіцыі (дадатак 9). Ці пазналі вы асобу на партрэце? *(Гэта наш зямляк — Васіль Быкаў).*

Васіль Быкаў — гэта пісьменнік-франтавік, які пісаў пра тое, што сам бачыў і перажыў. Зараз мы пра яго даведаемся падрабязней. Вучань-даследчык пазнаёміць з этапамі біяграфіі Васіля Уладзіміравіча Быкава.

*Вучань-даследчык.* "Нарадзіўся будучы пісьменнік 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і Уладзіміра Фёдаравіча і Ганны Рыгораўны. Меў малодшых сястру Валянціну і брата Мікалая. Жылі сціпла, працавалі багата. Любіў маленькі Васіль чытаць і маляваць. У 1938 годзе скончыў восем класаў Кубліцкай школы і паступіў у Віцебскае мастацкае вучылішча на жывапіснае аддзяленне, потым яго перавялі на скульптурнае. Праз год пакінуў гэту навучальную ўстанову, бо ў той час адмянілі дзяржаўныя стыпендыі — матэрыяльнае становішча сям'і не дазволіла працягнуць навучанне. Юнак паступіў у Віцебскую школу фабрычна-заводскага навучання №5, якую скончыў у маі 1941 года, пасля чаго быў накіраваны працаваць у горад Шостку. Калі пачалася вайна, Васіля Уладзіміравіча мабілізавалі на абарончыя работы, таксама ў складзе інжынернага батальёна ён будаваў аб'екты ў розных гарадах.

Зімой 1942 года апынуўся ў горадзе Аткарску Саратаўскай вобласці, там вучыўся ў чыгуначнай школе. Летам 1942 года быў прызваны ў Чырвоную Армію і накіраваны на вучобу ў Саратаўскае ваеннае вучылішча. З 1943 года ваяваў у званні малодшага лейтэнанта, потым — лейтэнанта, камандаваў спачатку стралковым узводам, а потым і ўзводам саракапяцiміліметровых гармат. Быў двойчы паранены. Бацькам выслалі паведамленне, што ён загінуў у баях. Аднак гэта было памылкаю: Васіль Уладзіміравіч атрымаў раненне. Каля горада Кіравагграда ёсць абеліск з пазначаным на ім імем нашага пісьменніка.

За ваенную службу В.У. Быкаў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай зоркі, медалём "За баявыя заслугі". У нашай музейнай экспазіцыі (дадатак 6) таксама ёсць узнагароды за баявыя подзвігі часоў Вялікай Айчыннай вайны — звярніце, калі ласка, увагу на экспанаты.

Баявы шлях Васіля Быкава працягваўся на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі, Аўстрыі. Пасля дэмабілізацыі ў маі 1947 года пісьменнік вярнуўся ў Беларусь, стаў жыць у Гродна. Ажаніўся з Надзеяй Андрэеўнай Кулагінай, тады студэнткай педінстытута, будучай настаўніцай рускай мовы і літаратуры. У хуткім часе ў сям'і нарадзіліся сыны — Сяргей і Васіль.

З Гродна пачалася літаратурная дзейнасць Васіля Уладзіміравіча: на старонках газеты "Гродзенская праўда" ў 1949 годзе з'явіліся яго першыя апавяданні на рускай мове ваеннай тэматыкі "У той дзень" і "У першым баі".

Пісьменніцкі талент дазволіў Васілю Быкаву стаць народным пісьменнікам. Гаварыць пра яго творчасць — гонар для нас і вялікая адказнасць!"

*Настаўнік.* Апавяданне "Незагойная рана" было напісана ў 1957 годзе. Звернемся да тэсту. Тэкля — галоўная гераіня твора. Давайце паспрабуем бліжэй з ёй пазнаёміцца, чытаючы апавяданне са спыненнямі, даючы каментарыі.

<u>Прыём "Чытанне з прыпынкамі" (дадатак 2).</u>

*Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку. Гарэзным свавольнікам выскаквае ён з-за вуглоў на цесны панадворак, цярэбіць саламяную страху хлеўчука, нібы дурэючы, тузае па Тэклінай спіне блытаныя махры яе хусткі.*

*Прыпынак 1.*

Давайце ўзгадаем лексічнае значэнне слова "*пейзаж*"[2] і вызначым, як пейзаж дапамагае ў стварэнні вобраза.

*Вучні даюць адказы.*

Чаму аўтар ужывае ў апісанні словы “свавольнікам”, “цярэбіць”, “дурэючы”, “тузае”? *(Нібы сама прырода, а акрамя яе ў старой жанчыны нікога, вяртае Тэклю да жыцця, паджартоўвае з яе, хоча скалынуць яе сэрца, абудзіць ад болю).*

*Ад ветру і холаду ў старой макрэюць запалыя вочы, яна раз-пораз выпростваецца і, прыставіўшы да чурбана выслізганае тапарышча, ражком хусткі выцірае слёзы. Потым яна стомлена ўздыхае і акідвае позіркам тыя некалькі паленцаў, што ўжо адсечаны ад жардзіны. Жанчына вельмі стамілася, а насекла столькі, што не хопіць і разу прапаліць у печы. Спачыўшы з хвіліну і аддыхаўшыся, яна зноў приступае нагой на тую жардзіну і ўзмахвае вышчарбленай сякерай.*

*Прыпынак 2.*

Чаму сякера “вышчарбленая”? *“Няма каму клапаціцца аб Тэклі. Яна ўсё, што ў яе ёсць”.*

Звярніце ўвагу на гэту бытавую[3] дэталь у творы — падрабязнае апісанне сякеры, якая з асаблівай сілай абуджае наша ўяўленне пра штодзённы побыт жанчыны і нясе значную эмацыянальную і сэнсавую нагрузку.

*Над пустым бульбянішчам Тэклінага агароду, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка і недзе разважна гяргечуць гусі.*

*Прыпынак 3.*

Чаму “за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка”? *(Трывожна чакае сама Тэкля навін ад паштальёна).*

*Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу. Відаць па ўсім, што яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах [1].*

*Прыпынак 4.*

Чаму так піша аўтар: “...чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах”? *(Чакае старая добрых навін, а сэрцам, магчыма, прадчувае, што тое добрае даўно абмінае яе хату).*

*Нарэшце на пагорку з'яўляецца імклівая постаць веласіпедыста, і Тэкля па нейкіх адной ёй вядомых прыкметах пазнае ў ім калгаснага пісьманосца. Веласіпедыст набліжаецца абочынай дарогі, потым унізе, пад пагоркам, злазіць з машыны, выводзіць яе з калдобін і зноў сядае, локцем адкінуўшы на спіну цяжкую сваю сумку.*

*Па меры яго набліжэння старую ўсё больш ахоплівае нецярплівасць. Яна кладзе сякеру і з незагароджанага двара выходзіць на гразкую вуліцу. Рукі яе неспакойна блукаюць па грудзях, без патрэбы абмацваюць світку, твар зморшчыўся ў пакутлівым выразе чакання, і ў вачах — нясцерпная туга надзеі. Калі пісьманосец звярнуў з дарогі ў вуліцу, жанчына па гразі шкандыбае насустрач, нібы баючыся, што ён без увагі абміне яе.*

*Прыпынак 5.*

Чаму Тэкля так сябе паводзіць: “Рукі яе неспакойна блукаюць па грудзях, без патрэбы абмацваюць світку”? *(Яна нібы выцірае рукі, каб чыстымі былі: рыхтуецца атрымаць ад пісьманосца ліст.)*

*Пісьманосец прыцішвае бег веласіпеда, але не спыняецца, а, узняўшы на жанчыну насуплены твар зморанага чалавека, груба папракае старую:*

*— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! — крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.*

*Прыпынак 6.*

Чаму пісьманосец так сябе паводзіць: “Узняўшы на жанчыну насуплены твар зморанага чалавека, груба папракае старую:

– Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! – крычыць”? *(Магчыма, ён стаміўся ад яе “сустраканняў”, а магчыма, больш за яе сэрцам адчувае, што чакае старая дарэмна — хоча вярнуць яе да рэчаіснасці).*

*Старая нібы камянее на месцы, доўга яшчэ глядзіць услед праезджаму, і ў вачах яе — боль і здзіўленне. Нейкі час яна стаіць так без слоў і без руху, аглушаная нявласкай чалавека. “Нічога няма”, — шэпчуць яе засмяглыя палінялыя вусны, і жанчына паволі ўнікае ў сэнс гэтых грубых слоў. Разбітай цяжкай хадою яна вяртаецца на панадворак да сваёй сякеры, але не падымае яе, а доўга стаіць над жардзінай і ўсё пазірае ў імглістую далеч. Па яе пасіверaных рудых шчоках ціха коцяцца слёзы.*

*Прыпынак 7.*

Чаму аўтар ужывае пры апісанні жанчына словы “камянее”, “аглушаная”? *(“Яна нібы сама сабе не належыць; яе, магчыма, ужо на свеце няма ў большай ступені, чым яе сына...”)*

*Яна доўга яшчэ глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай цёплы ліпеньскі дзень, высокае яснае неба і густое жыта абапал дарогі [1].*

*Прыпынак 8.*

Ці не з'яўляецца, на ваш погляд, гэта своеасаблівым алагізмам; ці адэкватная гэта старая жанчына? *(Адэкватная. Ёй проста хочацца сагрэцца халодным восеньскім днём. Роднага чалавека ў яе няма. Тады любы з нас можа сагрэцца ўспамінамі. Наша душа — тое месца, дзе мы можам сустрэцца з кім заўгодна. А самае галоўнае, што пра гэта можа нават ніхто і не даведацца — дзверы нашай душы мы можам расчыніць іншаму чалавеку толькі пры ўласным жаданні яго туды ўпусціць.)*

*Гэта было ў той, ужо далёкі, памятны год, калі пачалася вайна. І тады яна таксама стаяла тут і з роспаччу ў сэрцы пазірала на гэты шлях, а ногі яе імкнуліся бегчы туды, за ім, адзіным сынам, яе Васем. Шпаркай хадой рухавага чалавека ён хутка аддаляўся,*

---

[2]**ПЕЙЗА́Ж**, -у і -а, мн. -ы, -аў, м. **1.** -у. Агульны выгляд якой-н. мясцовасці, краявід. *Беларускія пейзажы. Нарачанскі п.* **2.** -а. Малюнак краявіду, а таксама апісанне прыроды ў мастацкім творы. *Выстаўка пейзажаў вядомага мастака. Палескія пейзажы ў творах Я. Коласа.* || *прым.* **пейза́жны**, -ая, -ае. *П. жывапіс* [3, с. 459].

[3]**БЫТ**, -у. М *бы́це*, м. Агульны жыццёвы ўклад, паўсядзённае жыццё. *Сельскі б.* ◊ **Быту не даваць** (разм.) — дакучаць, парушаючы чый-н. спакой. || *прым.* **бытавы́**, -áя, -óе. *Бытавыя паслугі* [3. с. 99].

*па самыя плечы затулены ўмалотнай высокай збажыной, не азірнуўся, аж покуль не адышоўся далёка. А яна, не адрываючы ад яго позірку, несціхана галасіла, вочы засцілалі слёзы і не давалі нагледзецца апошні раз на сваю васемнаццацігадовую надзею, сваё шчасце, частку яе матчынага сэрца. Толькі пасля ён спыніўся, павярнуўся да маткі, да роднай хаты і вёскі, пастаяў так, памахаў рукой, бы навек развітваўся з усім родным, сваім маленствам, маладосцю, і потым хутка знік за пагоркам.*

*Прыпынак 9.*

Чаму, на вашу думку, пры растанні матуля не магла адарваць ад яго позірку, а сын… нават не азірнуўся? Ці можна назваць яго  раўнадушным, калючым? Чым абумоўлены яго паводзіны? *(Ён сын! Добры, адданы, надзейны сын. У яго сэрца. Яно, магчыма, рвалася не менш, чым матуліна. І каб матуля хутчэй яго "адпусціла", ён сам гнаў хутчэй сябе прэч. Азірнешся – бы зноў будзеш развітвацца спачатку: новая і новая рана на сэрцы. А не павернешся – быццам бы прывучаеш сябе і таго, каго пакідаеш, да расстання як безвыходнасці.)*

*І знік, відаць, назаўсёды…*

*Прыпынак 10.*

Чаму аўтар ужывае слова "відаць"? *(Тэкля, хутчэй за ўсё, даўно адчувала, што сына няма жывога на свеце. Але пакуль яна чакала – у яе была надзея. Надзея – апошняе, што можна забраць у чалавека. Часам гэтым можна яго і знішчыць.)*

*Шаснаццаць страшных, нясцерпных год штогадзінным болем адмералі свой лік у матчыным сэрцы. Шаснаццаць год чакання, надзей, незабыўнага трывожнага спадзявання. Часам прыходзілі пісьмы ў розных канвертах і з зусім аднолькавым зместам: радавы Сподак Васіль Іванавіч у спісах забітых і прапаўшых без вестак не значыцца. Яны бянтэжылі і абнадзейвалі, гэтыя пісьмы, але ішоў час, а надзеі не спраўджваліся.*

*Прыпынак 11.*

Чаму твор мае такую назву? Як тэкст апавядання дапаможа нам адказаць на гэта пытанне? *(Раны на сэрцы матуль нашых, якія пакідаюць дзеці, ніколі не загойваюцца. "Шаснаццаць страшных, нясцерпных год штогадзінным болем адмералі свой лік у матчыным сэрцы" і тым нанеслі яму пажыццёвую рану. Яна будзе крывавіць, пакуль будзе гэта сэрца біцца. Раны на целе – рубцы, раны на сэрцы – боль.)*

Давайце паразважаем, якой вам уяўляецца гераіня апавядання. Якой паўстае перад вамі Тэкля?

*Вучні даюць адказы.*

Толькі пра адны суткі ідзе аповед у тэксце. І ўвесь гэты час сэрца жанчыны жыве толькі надзеямі і верай на зварот сына дадому.

Прыём "Кластар" (дадатак 3).

Абапіраючыся на вышэй прааналізаваны тэкст і ўвесь змест апавядання, складзіце кластар на тэму "Матчына сэрца", ужываючы толькі дзеясловы. Так і заўжды: нашы матулі, нашы бацькі чакаюць нас, сваіх дзяцей, нягледзячы на тое, што б з намі ні здарылася, куды б ні завялі нас жыццёвыя сцежкі. І сэрцы іх шукаюць, смуткуюць, вераць, б'юцца, сумуюць, спадзяюцца толькі на лепшае, бо такая любоў ні з чым не параўнальная!

**IV. Творчы адпачынак.**

А зараз самы час нам адпачыць. І давайце ў гэты момант мы шчыра падумаем з цеплынёй і любоўю пра нашых бацькоў, пра родных матуль. Чалавек абаронены ад жыццёвых нягод, пакуль блізкія ёсць на свеце…

*Гучыць песня ў выкананні Тамары Раеўскай "Калыханка маме" на словы Ніны Мацяш, музыка Яўгена Ксяневіча [2].*

**Куплет 1:**
Быць разам выпадае нам так мала.
Забудзь трывогу вечную сваю,
Прыляж, мая натомленая мама,
Як некалі ты мне, табе спяю.
**Прыпеў:**
Задрэмлюць веі над вачыма карымі –
Не дам упасці й парушынцы я.
Сустрэнься ў сне з сабой, мая ласкавая,
З вясной сваёю, любая мая.
**Куплет 2:**
Хоць кропля з абяцанага нам маем.
Збываецца праз мулкія гады.
Прыляж, мая даверлівая мама,
Спяю табе, як мне спявала ты.
**Прыпеў.**
**Куплет 3:**
Любоў нябёсы над табой трымае,
Любоўю зораць дні ў тваім акне.
Прыляж, мая усмешлівая мама,
Спяю табе, як ты спявала мне.
**Прыпеў.**

**V. Аналітычна-ўплывовы этап.**

Няма ў нашым жыцці чалавека даражэй за матулю. І калі яна не можа роднае дзіця наяве абняць, яна сустрэнецца з ім у сне…

Знайдзіце, калі ласка, у тэксце эпізод сну Тэклі. Звярніце ўвагу на вайсковую форму яе сына. Ці звыклымі для вас з'яўляюцца ўсе яе элементы? *(У апавяданні ёсць такі сказ: "І чаму кроў на яго пілотцы з маленькай зялёнай зорачкай". Мне здаецца, што на пілотках салдат былі чырвоныя зорачкі".)*

Звярніце ўвагу на экспанат з нашай музейнай экспазіцыі (дадатак 11). Вось так выглядае пілотка салдата. А чаму ў тэксце ўзгадваецца зялёная зорачка на ёй, аб гэтым вам раскажа наш музейны гісторык.

*Вучань-гісторык.* "Бляшаныя зоркі ваеннага часу, сапраўды, былі ахоўнага колеру – хакі. З'яўленне першых зорак на галаўных уборах ахоўнага колеру можна аднесці да загаду НКА СССР ад 1 жніўня 1941 года №253 "Аб змене ў форме адзення Чырвонай Арміі на ваенны час", які ўсталёўваў нашэнне "ахоўных" знакаў адрознення пры пятліцах "ахоўнага колеру" для кіраўнічага саставу ўсіх родаў войскаў, якія знаходзіліся на тэатры ваенных дзеянняў і ў маршавых часцях. У сувязі з поўным пераходам дзеючай арміі на металічныя зоркі колеру хакі, 14 красавіка 1942 года Усесаюзны камітэт стандартаў прыняў новую пастанову №2859, якая адмяніла патрабаванне ДАСТа на шапку-вушанку ў дачыненні да чырвонага колеру зоркі.

Да 1941 года зоркі, афарбаваныя ў ахоўны колер, не выкарыстоўваліся. У перыяд да 1942 года былі партыі зорак, афарбаваных у чырвоны колер, але іх было небагата, пэўная колькасць увогуле знікла ў ходзе вайны. У мэтах эканоміі зоркі на галаўныя ўборы пачалі вырабляць з найбольш таннага матэрыялу — бляхі" (малюнкі 1, 2).



Малюнак 1



Малюнак 2

*Настаўнік.* Вось якім цікавым аказаўся наш гістарычны дослед.

А зараз звернем увагу на картку-заданне "Гексы" (дадатак 4) і на нашу музейную экспазіцыю (дадатак 10). Прааналізаваўшы раней агучанае і абапіраючыся на змест апавядання, памятаючы пра гістарычныя падзеі, звязаныя з перыядам Вялікай Айчыннай вайны на беларускіх землях, паспрабуем дадаць цэнтральны гекс да нашай фігуры, абгрунтаваўшы свой выбар.

*Вучні даюць адказы.*

Які гекс і якія малюнкі з выставы сугучны па, на ваш погляд, найбольш пераклікаецца з ілюстрацыяй, змешчанай у падручніку? (Дадатак 3).

*Вучні даюць адказы.*

Сапраўды, 2025 год у гісторыі Беларусі асаблівы: мы святкуем 80-годдзе Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У гонар светлай памяці нашых вызваліцеляў узвышаюцца абеліскі, узводзяцца мемарыяльныя комплексы.

У апавяданні чытаем: "На пагорку, збоч ад дарогі, на ўзлеску незвычайна ярка і чыста неяк у гэты халодны восеньскі вечар бялеў каменны абеліск з зоркай наверсе – звычайны вайсковы помнік тым, хто не дайшоў да Берліна".

А якія мемарыяльныя комплексы, вядомыя вам, увекавечваюць мужнасць беларускага народа, праяўленую ў гады Вялікай Айчыннай вайны? *("Дальва", "Хатынь", "Лінія Сталіна", "Буйніцкае поле".)*

Давайце звернемся да насценнай карты музейнай экспазіцыі (дадатак 7) і пашукаем гэтыя мемарыялы.

*Вучні праводзяць дослед.*

Запішыце сабе ў сшытак тыя, пра якія даведаліся ўпершыню.

*Вучні робяць запісы.*

**VI. Рэфлексійна-ацэначны этап.**

Плённай была наша сённяшняя праца з тэкстам апавядання. Упэўнена, многае вы сёння грунтоўней зразумелі. Давайце свае ўражанні занатуем у выглядзе выніковага сінквейну па змесце тэксту, а за аснову працы возьмем вобраз галоўнай гераіні-маці.

<u>Прыём "Сінквейн".</u>

*Вучні складаюць і запісваюць сінквейны "Матуля".*

Хто хоча падзяліцца сваімі думкамі з усімі прысутнымі?

*Вучні зачытваюць сінквейны "Матуля"*[4].

Матуля.
Сардэчная, шчырая.
Чакае, спадзяецца, верыць.
Не траціць шчырай надзеі.
Птушка.

Матуля.
Клапатлівая, адзінокая.
Чакае, перажывае, цепліць надзею.
Сэрца матулі можа ўсё.
Анёл.

Матуля.
Гаротная, нядольная.
Моліцца, просіць, спадзяецца.
Верыць, што сын вернецца.
Гаротніца.

Вашы сінквейны — аснова невялікай творчай працы. Але аб усім па парадку. Звярніце ўвагу на музейную экспазіцыю (дадатак 8). Вы пазналі гэтыя трохвугольнікі?

*Вучні адказваюць.*

Так, гэта франтавыя пісьмы. Хто ведае, чаму ў іх такі выгляд? Паслухайце нашага музейнага даследчыка.

*Вучань-даследчык.* У час вайны былі цяжкасці з паперай. Без марак і канвертаў ішла амаль уся ваенная карэспандэнцыя. Пісалі, у асноўным, алоўкамі. Пры гэтым цэнзары, якія правяралі лісты перад адпраўкай, лёгка маглі прасачыць, каб нічога "лішняга" не было напісана. Такія пісьмы атрымлівалі ўсе з радасцю. А вось калі на канверце была наклеена марка, а чарнілам роўна напісаны адрас, то ўсе добра ведалі — гэта пахавальная. Больш інфармацыі можна знайсці па QR-коду (дадатак 12).

**VII. Дамашняе заданне. Інструктаж.**

Вы, напэўна, здагадаліся, што дома вам будзе прапанавана напісаць ліст ад імя радавога Сподака Васіля Іванавіча да матулі. Калі ласка, змяніце канцоўку апавядання на тую, аб якой так марыла старая Тэкля. Хай сын яе будзе жывы! Паверце, гэта мара ўсіх матуль, бацькоў свету! Зрабіць гэта варта таксама ў выглядзе пісьма-трохвугольніка. Майстар-клас па яго афармленні вы таксама знойдзіце па QR-коду (дадатак 12).

*Выстаўленне і каменціраванне адзнак.*

**VIII. Падагульняльны этап.**

На наступным уроку мы працягнем нашу гутарку па змесце апавядання. Мы паспрабуем раскрыць усе мастацкія прыёмы стварэння вобраза галоўнай гераіні, звярнуўшы асаблівую ўвагу на рэтраспекцыю і эпізадычныя вобразы ў творы. Нагадаю, што мінулы 2024 год быў двойчы юбілейным для беларусаў: да 80-годдзе з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў далучылася і 100-годдзе з дня нараджэння Васіля Уладзіміравіча Быкава. Таму сённяшні ўрок дазвольце мне закончыць уласным вершам "Памяць", прысвечаным земляку *(настаўнік чытае аўтарскі верш на памяць)* (дадатак 13).

Вайна... Страшэнным болем адгукаецца яна праз

[4]Прыклады, складзеныя вучнямі.

гады ў нашых сэрцах, нагадвае пра сябе, не дае душы спакою. Вайна — найвялікшае сацыяльнае зло, якое толькі можа прыдумаць чалавек! І каб яна не паўтарылася, кожнае пакаленне павінна жыць і памятаць урокі мінулага!

**Спіс літаратуры**

1. Быкаў, В. Поўны збор твораў: у 14 т. / В. Быкаў. — Мінск, Саюз беларускіх пісьменнікаў; Масква, ТАА «Выдавецтва «Время», 2009. — Т. 7 Апавяданні. — 482 с.

2. Калыханка маме: [верш] / Ніна Мацяш // Звязда. — 2009. — 26 верасня.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы: Больш за 65 000 слоў / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко; Афармленне А.М. Хількевіча. — Мінск: БелЭн, 1996. — 784 с.

Дадатак 1

**Картка-заданне “Пераблытаныя цытаты”**

☐ “Не, яго не было тут. “Лейтэнант Авер'янаў, гвардыі старшына Кузняцоў, радавыя Бондараў, Піліпенка, Чарных і іншыя”. Але хто ж гэтыя іншыя, чаму не напісаны іхнія імёны?”

☐ “Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу. Відаць па ўсім, што яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах.”

☐ “Пісьманосец прыцішвае бег веласіпеда, але не спыняецца, а, узняўшы на жанчыну насуплены твар змoранага чалавека, груба папракае старую:

— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! – крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.”

☐ “Тэкля моўчкі слухала і не чула дзявочай гамонкі, у галаве яе плылі маркотныя даўнія думкі. Неяк няўцямна старая намацала на прыпечку няпоўны карабок запалак, аддала дзяўчыне.”

☐ “Тэкля некуды ішла, ужо і сама не ведала, куды і па што. Усё больш апаноўвалі яе роспач і гора, яна ведала пэўна, што шчасце не спаткае яе на гэтай дарозе. Але не магла яна і вярнуцца назад – не было ўжо сілы ў яе на тое вяртанне.”

☐ “– Мама, глянь: бачыш, які захад? Праўда, падобна на вялізнае пажарышча? А бадай, і сапраўды запалае зямля. Вайна будзе, мамачка Я пайду туды, застанецеся вы з Марыськай.”

**Картка-заданне “Пераблытаныя цытаты” (адказы)**

**6** “Не, яго не было тут. “Лейтэнант Авер'янаў, гвардыі старшына Кузняцоў, радавыя Бондараў, Піліпенка, Чарных і іншыя”. Але хто ж гэтыя іншыя, чаму не напісаны іхнія імёны?”

**1** “Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу. Відаць па ўсім, што яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах.”

**2** “Пісьманосец прыцішвае бег веласіпеда, але не спыняецца, а, узняўшы на жанчыну насуплены твар змoранага чалавека, груба папракае старую:

— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! – крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.”

**3** “Тэкля моўчкі слухала і не чула дзявочай гамонкі, у галаве яе плылі маркотныя даўнія думкі. Неяк няўцямна старая намацала на прыпечку няпоўны карабок запалак, аддала дзяўчыне.”

**5** “Тэкля некуды ішла, ужо і сама не ведала, куды і па што. Усё больш апаноўвалі яе роспач і гора, яна ведала пэўна, што шчасце не спаткае яе на гэтай дарозе. Але не магла яна і вярнуцца назад – не было ўжо сілы ў яе на тое вяртанне.”

**4** “— Мама, глянь: бачыш, які захад? Праўда, падобна на вялізнае пажарышча? А бадай, і сапраўды запалае зямля. Вайна будзе, мамачка Я пайду туды, застанецеся вы з Марыськай.”

Дадатак 2

**Картка-заданне “Чытанне з прыпынкамі”**

Буяе над абшарамі сцюдзёны асенні вецер, змятае пад прызбы пажоўклае лісце, гайдае мокрае галлё ў садку. Гарэзным свавольнікам выскаквае ён з-за вуглоў на цесны панадворак, цярэбіць саламяную страху хлеўчука, нібы дурэючы, тузае па Тэклінай спіне блытаныя махры яе хусткі.

**ПРЫПЫНАК 1** — *Чаму аўтар ужывае ў апісанні словы “свавольнікам”, “цярэбіць”, “дурэючы”, “тузае”?*

Ад ветру і холаду ў старой макрэюць запалыя вочы, яна раз-пораз выпростваецца і, прыставіўшы да чурбана выслізганае тапарышча, ражком хусткі выцірае слёзы. Потым яна стомлена ўздыхае і акідвае позіркам тыя некалькі паленцаў, што ўжо адсечаны ад жардзіны. Жанчына вельмі стамілася, а насекла столькі, што не

хопіць і разу прапаліць у печы. Спачыўшы з хвіліну і аддыхаўшыся, яна зноў прыступае нагой на тую жардзіну і ўзмахвае вышчарбленай сякерай.

**ПРЫПЫНАК 2** — *Чаму сякера "вышчарбленая"?*

Над пустым бульбянішчам Тэклінага агароду, над недалёкім выганам і дарогай, што, узбегшы на ўзгорак, хаваецца ў шэрай далечы, марудна паўзе восеньскі адвячорак. Некуды спяшаюцца імклівыя пакудлачаныя хмары ў небе, за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка і недзе разважна гяргечуць гусі.

**ПРЫПЫНАК 3** — *Чаму "за хатамі ў вёсцы трывожна бляе авечка"?*

Тэкля сячэ, адпачывае ў кароткіх перапынках і ўвесь час азірае дарогу. Відаць па ўсім, што яна кагосьці чакае, і гэтае чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах.

**ПРЫПЫНАК 4** — *Чаму так піша аўтар: "чаканне балючым адбіткам тугі і надзеі свеціцца ў яе слязлівых вачах"?*

Нарэшце на пагорку з'яўляецца імклівая постаць веласіпедыста, і Тэкля па нейкіх адной ёй вядомых прыкметах пазнае ў ім калгаснага пісьманосца. Веласіпедыст набліжаецца абочынай дарогі, потым унізе, пад пагоркам, злазіць з машыны, выводзіць яе з калдобін і зноў сядае, локцем адкінуўшы на спіну цяжкую сваю сумку.

Па меры яго набліжэння старую ўсё больш ахоплівае нецярплівасць. Яна кладзе сякеру і з незагароджанага двара выходзіць на гразкую вуліцу. Рукі яе неспакойна блукаюць па грудзях, без патрэбы абмацваюць світку, твар зморшчыўся ў пакутлівым выразе чакання, і ў вачах — нясцерпная туга надзеі. Калі пісьманосец звярнуў з дарогі ў вуліцу, жанчына па гразі шкандыбае насустрач, нібы баючыся, што ён без увагі абміне яе.

**ПРЫПЫНАК 5** — *Чаму так паводзіць сябе Тэкля: "Рукі яе неспакойна блукаюць па грудзях, без патрэбы абмацваюць світку"?*

Пісьманосец прыцішвае бег веласіпеда, але не спыняецца, а, узняўшы на жанчыну насуплены твар зморанага чалавека, груба папракае старую:

— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! — крычыць ён у твар жанчыне і знікае за рогам.

**ПРЫПЫНАК 6** — *Чаму так сябе паводзіць пісьманосец: "узняўшы на жанчыну насуплены твар зморанага чалавека, груба папракае старую:*

*— Ну што ты мяне пільнуеш усё? Няма ж табе нічога. Нічога няма! — крычыць"?*

Старая нібы камянее на месцы, доўга яшчэ глядзіць услед праезджаму, і ў вачах яе — боль і здзіўленне. Нейкі час яна стаіць так без слоў і без руху, аглушаная няласкай чалавека. "Нічога няма", — шэпчуць яе засмяглыя палінялыя вусны, і жанчына паволі ўнікае ў сэнс гэтых грубых слоў. Разбітай цяжкай хадою яна вяртаецца на панадворак да сваёй сякеры, але не падымае яе, а доўга стаіць над жардзінай і ўсё пазірае ў імглістую далеч. Па яе пасівераных рудых шчоках ціха коцяцца слёзы.

**ПРЫПЫНАК 7** — *Чаму аўтар ужывае пры апісанні жанчына словы "камянее", "аглушаная"?*

Яна доўга яшчэ глядзіць на сумны пагорак, гразкую дарогу і бачыць над гэтай мясцінай цёплы ліпеньскі дзень, высокае яснае неба і густое жыта абапал дарогі.

**ПРЫПЫНАК 8** — *Ці не з'яўляецца, на ваш погляд, гэта своеасаблівым алагізмам; ці адэкватная гэта старая жанчына?*

Гэта было ў той, ужо далёкі, памятны год, калі пачалася вайна. І тады яна таксама стаяла тут і з роспачу ў сэрцы пазірала на гэты шлях, а ногі яе імкнуліся бегчы туды, за ім, адзіным сынам, яе Васем. Шпаркай хадой рухавага чалавека ён хутка аддаляўся, па самыя плечы затулены ўмалотнай высокай збажынай, не азірнуўся, аж покуль не адышоўся далёка. А яна, не адрываючы ад яго позірку, несціхана галасіла, вочы засцілалі слёзы і не давалі нагледзецца апошні раз на сваю васемнаццацігадовую надзею, сваё шчасце, частку яе матчынага сэрца. Толькі пасля ён спыніўся, павярнуўся да маткі, да роднай хаты і вёскі, пастаяў так, памахаў рукой, бы навек развітваўся з усім родным, сваім маленствам, маладосцю, і потым хутка знік за пагоркам.

**ПРЫПЫНАК 9** — *Вы ведаеце, напэўна, што такое расстанне. Чаму, на вашу думку, матуля не магла адарваць ад яго позірку, а сын... нават не азірнуўся? Ён нейкі раўнадушны, калючы? Ці яго паводзіны абумоўлены нечым іншым?*

І знік, відаць, назаўсёды...

**ПРЫПЫНАК 10** — *Чаму аўтар ужывае слова "відаць"?*

Шаснаццаць страшных, нясцерпных год штогадзінным болем адмералі свой лік у матчыным сэрцы. Шаснаццаць год чакання, надзей, незабыўнага трывожнага спадзявання. Часам прыходзілі пісьмы ў розных канвертах і з зусім аднолькавым зместам: радавы Сподак Васіль Іванавіч у спісах забітых і прапаўшых без вестак не значыцца. Яны бянтэжылі і абнадзейвалі, гэтыя пісьмы, але ішоў час, а надзеі не спраўджваліся.

**ПРЫПЫНАК 11** — *Чаму твор мае такую назву? Як вышэй агучаны тэкст дапаможа нам адказаць на гэта пытанне?*

Дадатак 3




**Варыянт афармлення кластара**



Дадатак 4



**Варыянт афармлення**



Дадатак 5

**Музейная экспазіцыя. “Сцяна болю”**



Дадатак 6

**Фрагмент музейнай экспазіцыі. Узнагароды**




Дадатак 7

**Музейная экспазіцыя. Насценная карта**




Дадатак 8

**Музейная экспазіцыя. Франтавыя пісьмы**



Дадатак 9

**Музейная экспазіцыя. Партрэты В.У. Быкава**






Дадатак 10

**Музейная экспазіцыя. Стэнд “Шлях да перамогі”**




Дадатак 11

**QR-код доступа да матэрыялаў:**

***інфармацыі пра франтавыя пісьмы***

***майстар-клас па афармленні пісьма-трохвугольніка***

Дадатак 12

**Памяць**

*А.Н. Прохарава*

Паліла свечкі Памяць і плакала сама:
Сучаснікам не ўцяміць, якой вайна была
(Крывавай і падманнай, дзікунскай і сляпой!) –
Дзяцей, старых, нямоглых знішчала пад сабой.
І што нам застаецца, усім тым, хто прагне жыць?
Трымаць Памяць ля сэрца, каб годна паслужыць
Той мужнасці, адвазе Салдат нашай зямлі,
Што ў шынялях пацёртых спакой наш зберагглі.
“А Быкаў што?” – “Ён вечны, як матухна-зямля,
Ён гонар і сумленне, якіх у нас не адняць!”
Чытайце яго творы праз сто, праз дзвесце год,
Бо быў і вечна будзе вялікім наш народ!
“Альпійская балада”, “Адна ноч, “Абеліск”,
“У тумане”, “Воўчая зграя” і “Мёртвым не баліць”...
І доўга, доўга-доўга цягнуцца можа спіс,
З якога Памяць сэрцу нясе зваротны кліч,
Каб мы не забывалі, былое берагглі,
Каб мы з сябе спыталі, за што ўсе палягглі,
Каму было за сорак, каму – за дваццаць пяць,
Хто мог бы жыць, смяяцца і дзетак нараджаць.
Па сіле чалавеку, які спазнаў боль страт,
Нам, хто не нюхаў порах, яго данесці чад...
Жыццё зацягне раны, зноў узрастуць сады,
І перад ветэранам мы схілімся заўжды:
У паклоне за нябёсы, за шыр іх, глыбіню,
Што мірна над народам сягаюць увышыню.
За тое, што мы сіла, што ў байцы – маналіт!
Ах, Памяць, наша Памяць, з кніг Быкава – граніт!
Свой лёс у чалавека, ды ён драбок зямлі.
Яна ж заўжды чакае, як доўга б не ішлі
Яго старыя ногі да роднага сяла,
Дзе матчына магіла, святая дзе зямля.
Цяпер навек спатканне: Васіль і родны дом.
Прымі яго, Айчына, ён сын адданы твой!

*Дата поступления в редакцию: 23.04.2025*